ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь
25.05.2011 № 191
(у рэдакцыі пастановы Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь
19.06.2019 № 253)

# ІНСТРУКЦЫЯ
## аб парадку ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак прадстаўлення да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь (далей, калі не вызначана іншае, – Ганаровая грамата), а таксама ўмовы ўзнагароджання.

2. Ганаровай граматай узнагароджваюцца работнікі Нацыянальнага банка, банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, іншых арганізацый, нацыянальных (цэнтральных) банкаў і банкаўскіх устаноў замежных дзяржаў, устаноў адукацыі.

3. Ганаровая грамата з’яўляецца сродкам заахвочвання за:

значны асабісты ўклад у вырашэнне задач у галіне грашова-крэдытнай палітыкі;

шматгадовую (не менш за дзесяць гадоў) і плённую дзейнасць у Нацыянальным банку;

высокія дасягненні ў працы, прафесійнае майстэрства, добрасумленнае выкананне службовых абавязкаў, ініцыятыўнасць;

значны ўклад у падрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі і паслядыпломнае навучанне спецыялістаў для фінансавага сектара эканомікі;

развіццё і ўмацаванне міждзяржаўнага супрацоўніцтва ў фінансавай сферы.

Падставай для ўзнагароджання работнікаў Ганаровай граматай не могуць з’яўляцца юбілейныя даты нараджэння.

4. Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай ажыццяўляецца па ініцыятыве:

Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка або яго намеснікаў;

кіраўнікоў структурных падраздзяленняў цэнтральнага апарату і структурных падраздзяленняў Нацыянальнага банка;

кіраўнікоў арганізацый.

5. Для разгляду пытання аб узнагароджанні Ганаровай граматай:

5.1. работнікаў банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, іншых арганізацый, нацыянальных (цэнтральных) банкаў і банкаўскіх установ замежных дзяржаў, устаноў адукацыі, за выключэннем работнікаў Нацыянальнага банка, арганізацыямі, у якіх яны працуюць, у Нацыянальны банк прадстаўляюцца наступныя дакументы:

суправаджальнае пісьмо;

прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай па форме згодна з дадаткам, запоўненае на беларускай мове з выкарыстаннем камп'ютарных тэхналогій (далей, калі не вызначана іншае, – прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай), якое падпісваецца кіраўніком арганізацыі, яго намеснікам (у выпадку прадстаўлення да ўзнагароджання кіраўніка арганізацыі);

даведка-аб'ектыўка на асобу;

рашэнне калегіяльнага выканаўчага органа арганізацыі аб прадстаўленні да ўзнагароджання асобы (пры яго наяўнасці);

копія старонкі пашпарта, якая пацвярджае прозвішча асобы;

ліст аб узгадненні кіраўніком органа кіравання арганізацыі (пры яго наяўнасці) або кіраўніком вышэйстаячай арганізацыі (у выпадку прадстаўлення да ўзнагароджання кіраўніка арганізацыі);

5.2. работнікаў Нацыянальнага банка ў кадравую службу Нацыянальнага банка накіроўваецца прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай, якое падпісваецца кіраўніком структурнага падраздзялення цэнтральнага апарату Нацыянальнага банка, па ініцыятыве якога асоба прадстаўляецца да ўзнагароджання.

6. Прадстаўленне да ўзнагароджання Ганаровай граматай узгадняецца:

намеснікам Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка, які накіроўвае дзейнасць структурнага падраздзялення цэнтральнага апарату або структурнага падраздзялення Нацыянальнага банка, што выступіла ініцыятарам узнагароджання;

намеснікам Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка, які накіроўвае дзейнасць кадравай службы Нацыянальнага банка;

кіраўніком кадравай службы Нацыянальнага банка;

пры неабходнасці зацікаўленымі структурнымі падраздзяленнямі цэнтральнага апарату або структурнымі падраздзяленнямі Нацыянальнага банка, а таксама намеснікамі Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка, якія накіроўваюць дзейнасць гэтых структурных падраздзяленняў.

7. Рашэнне аб узнагароджанні Ганаровай граматай работнікаў Нацыянальнага банка прымае Старшыня Праўлення Нацыянальнага банка, іншых грамадзян – Праўленне Нацыянальнага банка.

8. Адначасова работнікам Нацыянальнага банка, узнагароджаным Ганаровай граматай, выплачваецца грашовая прэмія ў памеры, прадугледжаным лакальным прававым актам Нацыянальнага банка, або ўручаецца каштоўны падарунак на ўстаноўленую суму.

Прэміраванне работнікаў банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, іншых арганізацый, нацыянальных (цэнтральных) банкаў і банкаўскіх устаноў замежных дзяржаў, устаноў адукацыі ў сувязі з узнагароджаннем Ганаровай граматай ажыццяўляецца за кошт сродкаў арганізацыі ва ўстаноўленым адпаведнай арганізацыяй парадку.

Дадатак
да Інструкцыі аб парадку ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь

Форма

# ПРАДСТАЎЛЕННЕ
## да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку (пры яго наяўнасці)
2. Чысло, месяц і год нараджэння
3. Пасада, месца працы (службы)
4. Грамадзянства
5. Ці ўзнагароджваўся раней Ганаровай граматай Нацыянальнага банка, дата ўзнагароджання
6. Стаж работы:

   у Нацыянальным банку

   у дадзенай арганізацыі
7. Звесткі аб узнагароджаннях, у тым ліку аб узнагароджаннях Нацыянальнага банка (чым, калі)
8. Характарыстыка з указаннем заслуг, за якія работнік прадстаўляецца да ўзнагароджання Ганаровай граматай Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь

| ______________________ | ______________ | ______________________ |
|---|---|---|
| (пасада) | (подпіс) | (ініцыялы, прозвішча) |

”___“_________20__ г.